БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 911.3 : 332.12 (476) (043.3)

**ЗАПРУДСКІ**
**Ілья Ігаравіч**

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНА-ГАЛІНОВАЙ СТРУКТУРЫ І РЭГІЯНАЛІЗАЦЫЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені кандыдата геаграфічных навук

па спецыяльнасці 25.03.02 – эканамічная, сацыяльная,
палітычная і рэкрэацыйная геаграфія

Мінск, 2019

Навуковая работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Шэлег Мікалай Сідаравіч**<br>доктар эканамічных навук, прафесар,<br>прафесар кафедры эканомікі гандлю і паслуг факультэта камерцыі і турыстычнай індустрыі Ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» |
| Афіцыйныя апаненты | **Фацееў Уладзімір Сяргеевіч**<br>доктар эканамічных навук, прафесар,<br>прафесар кафедры нацыянальнай эканомікі і дзяржаўнага кіравання факультэта эканомікі і менеджменту Ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» |
| | **Шадракоў Аляксей Васільевіч**<br>кандыдат геаграфічных навук, дацэнт,<br>загадчык Магілёўскага рэгіянальнага цэнтра сацыяльна-эканамічных даследаванняў Дзяржаўнай навуковай установы «Навукова-даследчы эканамічны інстытут Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь» |
| Апаніруючая арганізацыя | Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна» |

Абарона адбудзецца 14 мая 2019 г. у 14.00 на паседжанні савета па абароне дысертацый Д 02.01.06 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Ленінградская, 8 (юрыдычны факультэт), аўд. 407. Тэлефон вучонага сакратара (8-017) 209-55-58, e-mail: antipova@bsu.by.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «10» красавіка 2019 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый Д 02.01.06,
доктар геаграфічных навук, прафесар К. А. Анціпава

# УВОДЗІНЫ

Напрыканцы XX ст. на палітычнай карце Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы адбылося станаўленне суверэнных дэмакратычных дзяржаў, адной з якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. У гэтых абставінах пачынаецца новы этап функцыянавання нацыянальнай эканомікі, які характарызуецца зменай эканоміка-геаграфічнага становішча, умоў і правіл знешнегандлёвай дзейнасці. Па сутнасці, краіна апынулася перад неабходнасцю наноў шукаць сваё месца ў міжнародным геаграфічным падзеле працы. Прамысловасць, як галоўная галіна матэрыяльнай вытворчасці, адыгрывае вядучую ролю ў вызначэнні спецыялізацыі краіны. Так, па класіфікацыі Сусветнага банка Рэспубліка Беларусь з'яўляецца індустрыяльнай постсацыялістычнай краінай з пераходнай эканомікай, а ў рэйтынгу развіцця прамысловай вытворчасці ЮНІДО (CIP rank) у 2016 г. яна заняла 41 месца і патрапіла ў групу развітых індустрыяльных краін.

Пераўтварэнні непазбежна вядуць да змен у тэрытарыяльнай арганізацыі прамысловасці, аснову якіх складае трансфармацыя яе тэрытарыяльна-галіновай структуры. Дадзены працэс працякае з рознай інтэнсіўнасцю пад уздзеяннем эндагенных і экзагенных фактараў і аказвае непасрэдны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў. Актуальнасць прапанаванага даследавання ў тым, што эканоміка-геаграфічны аналіз трансфармацыі тэрытарыяльна-галіновай структуры за перыяд з 1991 г. па 2016 г. дазволіць вызначыць прычынна-выніковыя адносіны паміж элементамі прамысловай сістэмы, ахарактарызаваць яе сучасны стан і перспектывы развіцця для ўдасканалення рэгіянальнай прамысловай палітыкі.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі**. Дысертацыйная работа выконвалася з улікам: 1) Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2030 г. (Пратакол № 3 пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10.02.2015 г.); 2) Праграмы развіцця прамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 05.07.2012 г. № 622), якая прадугледжвае паэтапнае рэфармаванне сістэмы дзяржаўнага кіравання прамысловасцю. Тэма дысертацыі адпавядае прыярытэтным кірункам навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2016–2020 гг. – п. 11. «Грамадства і эканоміка».

Дысертацыйнае даследаванне выконвалася у рамках наступных НДР: 1) «Асаблівасці тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі рэгіёнаў Беларусі ва ўмовах інавацыйнага развіцця» (планавая НДР БДУ, 2011–2015 гг.,

№ ДР 20131088); 2) «Трансфармацыя тэрытарыяльнай структуры рэгіёнаў Беларусі» (планавая НДР БДУ, 2016–2017 гг., № ДР 20162507).

**Мэта дысертацыйнага даследавання** заключаецца ў выяўленні прасторава-часавых заканамернасцей развіцця і змен тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці Рэспублікі Беларусь для абгрунтавання рэгіянальна-дыферэнцыраваных рэкамендацый па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл. Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

1) прааналізаваць тэарэтычныя і метадалагічныя падыходы да вывучэння тэрытарыяльнай арганізацыі прамысловасці;

2) распрацаваць алгарытм эканоміка-геаграфічнага даследавання трансфармацыі тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці;

3) вызначыць дамінуючыя фактары размяшчэння вытворчасці ў краіне і іх уплыў на тэрытарыяльную структуру прамысловасці;

4) прасачыць асноўныя тэрытарыяльна-галіновыя зрухі ў развіцці прамысловасці Беларусі на сучасным этапе;

5) правесці ацэнку тэрытарыяльнай нераўнамернасці і стварыць тыпалогію рэгіёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця;

6) прапанаваць напрамак, падыходы і прынцыпы ўдасканалення размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

*Аб'ектам* дысертацыйнага даследавання з'яўляецца прамысловасць Рэспублікі Беларусь. *Прадмет* даследавання – тэрытарыяльна-галіновая структура прамысловасці Рэспублікі Беларусь, фактары і ўмовы яе трансфармацыі за перыяд з 1991 г. па 2016 г. Інфармацыйную базу даследавання склалі даныя Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь па 6 абласцях і гораду Мінску за перыяд з 1991 г. па 2016 г., па 118 адміністрацыйных раёнах разам з гарадамі абласнога падпарадкавання за перыяд з 2005 г. па 2016 г. На аснове сабраных крыніц інфармацыі база таксама ўключае распрацаваны аўтарам каталог прамысловых прадпрыемстваў па іх форме ўласнасці, гісторыі функцыянавання і месцазнаходжанні.

**Навуковая навізна** даследавання заключаецца ў тым, што ўпершыню вызначаны прасторава-часавыя асаблівасці трансфармацыі тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці Беларусі згодна з канцэпцыяй доўгіх цыклаў эканамічнай актыўнасці М. Кандрацьева. У дысертацыі таксама адлюстраваны новыя аспекты даследавання геаграфіі прамысловасці Беларусі: 1) прапанавана ўдакладненая дэфініцыя тэрміна «тэрытарыяльная арганізацыя прамысловасці»; 2) распрацаваны алгарытм эканоміка-геаграфічнага даследавання трансфармацыі тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці; 3) на аснове рэтраспектыўнага аналізу вылучаны хвалі індустрыялізацыі, якія назіраліся ў рэспубліцы ў пасляваенны перыяд;

4) упершыню праведзена ацэнка ступені ўплыву розных фактараў на размяшчэнне прамысловасці ў Беларусі па этапах эканамічнага цыкла; 5) для стварэння тыпалогіі распрацаваны інтэгральны індэкс прамысловага развіцця рэгіёнаў; 6) прапанаваны механізм размежавання ў прамысловай палітыцы функцый і паўнамоцтваў паміж цэнтральнымі і рэгіянальнымі органамі ўлады.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

**1.** ***Алгарытм эканоміка-геаграфічнага даследавання тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці***, у аснову якога пакладзены сістэмна-структурны і стадыйна-эвалюцыйны падыходы, прадугледжвае выкарыстанне: 1) рэтраспектыўнага і фактарнага аналізаў развіцця прамысловасці; 2) бальнай ацэнкі рэкамбінацыі фактараў размяшчэння вытворчасці; 3) марфалагічнага аналізу лінейна-вузлавой тэрытарыяльнай структуры прамысловасці; 4) матэматыка-статыстычнага аналізу тэрытарыяльна-структурных зрухаў; 5) эканоміка-геаграфічнай ацэнкі тэрытарыяльнай нераўнамернасці рэгіёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця. Гэта ў сукупнасці ўдасканальвае методыку эканоміка-геаграфічнага вывучэння прамысловасці і дазваляе ахарактарызаваць умовы і фактары яе тэрытарыяльна-галіновай трансфармацыі ў краіне.

**2.** ***Прасторава-часавыя трэнды развіцця тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці Беларусі за перыяд з 1991 г. па 2016 г.***, упершыню выяўленыя на аснове прапанаванай стадыйнасці доўгіх цыклаў эканамічнай актыўнасці з вылучэннем 4 этапаў: дэпрэсіі IV цыкла (1991–1994 гг.), ажыўлення (1995–2000 гг.), уздыму (2001–2008 гг.) і вяршыні (2009–2016 гг.) V цыкла, і адпаведных ім тэрытарыяльна-структурных зрухаў, паказалі: 1) змяншэнне долі базавых (машынабудаванне і лёгкая прамысловасць) пры павелічэнні долі традыцыйных (харчовая, лясная прамысловасць і вытворчасць будматэрыялаў) і хіміка-тэхналагічных галін (паліўная і хімічная прамысловасць) спецыялізацыі па прычыне экспартаарыентаванасці і высокай залежнасці краіны ад кан’юнктуры на знешніх рынках; 2) наяўнасць істотных структурных зрухаў на этапе дэпрэсіі і змяншэнне дыверсіфікаванасці галіновай структуры, пачынаючы з XXI ст., звязанае са стабільным ростам вытворчасці ў азначаных галінах прамысловасці; 3) рэгіяналізацыю прамысловасці з кардынальным гістарычным пераходам лідарства ў прамысловай вытворчасці да Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцей ад сталіцы – горада Мінска, што даказвае трансфармацыю структуры прамысловасці і патрабуе правядзення эканоміка-геаграфічнага даследавання на раённым іерархічным узроўні.

**3.** ***Тыпалогія раёнаў Рэспублікі Беларусь па ўзроўні прамысловага развіцця, упершыню распрацаваная з выкарыстаннем створанага каталога прамысловых прадпрыемстваў у дачыненні да этапу вяршыні цыкла***

***эканамічнай актыўнасці (2009–2016 гг.) на прынцыпах цэнтр-перыферыйнасці***, дазволіла выявіць з улікам адрозненняў у інтэгральным індэксе прамысловага развіцця (*IDI*), які складаецца з ацэнкі маштабу (*SIP*), геаграфічнай канцэнтрацыі (*CIP*) і эфектыўнасці прамысловасці (*IE*), *тры тыпы раёнаў* (цэнтральныя (*I*), паўперыферыйныя (*II*) і перыферыйныя (*III*)) і вызначыць лідарства ў аб'ёме прамысловай вытворчасці раёнаў *I*-га тыпу, на якія прыходзілася ў 2016 г. каля 68 % агульнарэспубліканскага прамысловага вырабу, 10 % ад агульнай колькасці раёнаў і плошчы краіны. Даказаная тэрытарыяльная канцэнтрацыя прамысловасці з'яўляецца падставай для неабходнасці ўдасканалення рэгіянальнай прамысловай палітыкі.

**4.** ***Рэгіянальна-дыферэнцыраваныя рэкамендацыі па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці Рэспублікі Беларусь***, распрацаваныя на аснове выяўленых адрозненняў раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця з улікам рэгіяналізацыі і «даганяючага» сцэнару сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, прадугледжваюць: 1) для цэнтральных раёнаў (тып *I*) паскоранае развіццё высокатэхналагічнага сектара на аснове вытворчасцей V і VI тэхналагічных укладаў у СЭЗ і тэхнапарках; 2) для паўперыферыйных (тып *II*) – развіццё спадарожнай інфраструктуры і вытворчасцей базавай спецыялізацыі шляхам актыўнай падтрымкі кластарнай ініцыятывы; 3) для перыферыйных (тып *III*) – развіццё традыцыйных галін і падтрымку прадпрымальніцтва шляхам прадстаўлення ільготных крэдытаў, што будзе спрыяць актывізацыі інавацыйнай дзейнасці і створыць у прасторы ўстойлівы каркас разнастайных зон апераджальнага развіцця, здольных трансліраваць інавацыі на перыферыю.

**Асабісты ўнёсак саіскальніка вучонай ступені.** Асноўныя палажэнні і вынікі, прапанаваныя ў навуковай рабоце, атрыманы дысертантам самастойна. Асабісты ўнёсак саіскальніка заключаецца ў сістэматызацыі навуковых падыходаў, якія зацвердзіліся ў геаграфіі прамысловасці; у вылучэнні перыядаў развіцця прамысловасці ў Беларусі, якія адпавядаюць цыклам М. Кандрацьева; у распрацоўцы тыпалогіі раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця. Палажэнні і атрыманыя вынікі, сфармуляваныя ў дысертацыі, адлюстраваны ў публікацыях саіскальніка. Дысертацыя з'яўляецца самастойным, цэласным і завершаным навуковым даследаваннем.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.** Палажэнні і вывады дысертацыі дакладаліся і абмяркоўваліся на канферэнцыях: I, II, III, IV і V Міжвузаўскіх студэнцкіх канферэнцыях з міжнародным удзелам «Демографические риски XXI века», прысвечаных Міжнароднаму дню народанасельніцтва (Мінск, май 2013–2018 гг.); Міжнародным навукова-практычным семінары «Интеграция на постсоветском пространстве: реалии и

перспективы» (Мінск, 4–7 снежня 2014 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Проблемы и перспективы социально-экономической географии (к 100-летию со дня рождения И. И. Трухана)» (Мінск, 12–14 лістапада 2015 г.); VI Міжнародным кангрэсе даследчыкаў Беларусі (Каунас, 7–9 кастрычніка 2016 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных «Х Машеровские чтения» (Віцебск, 14 кастрычніка 2016 г.); Міжвузаўскім рэспубліканскім семінары «Социально-экономическая география в XXI веке: региональное развитие (к 125-летию со дня рождения профессора А. А. Смолича)» (Мінск, 17-18 лістапада 2016 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Географические аспекты устойчивого развития регионов» (Гомель, 23–24 сакавіка 2017 г.).

Матэрыялы выкананага даследавання выкарыстоўваліся: 1) ДНУ «НДЭІ Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь» пры выкананні планавай НДР «Распрацаваць прапановы па вызначэнні спецыялізацыі, стварэнні і забеспячэнні развіцця навукова-тэхналагічных і прамысловых паркаў у рэгіёнах Рэспублікі Беларусь з улікам наяўнага патэнцыялу і перспектыў яго далейшага выкарыстання» (акт укаранення № 57-02/1875 ад 20.12.2017 г.); 2) РУП «Белкартаграфія» пры выданні насценнай вучэбнай карты «Республика Беларусь. Металлургическое производство. Производство машин, оборудования и транспортных средств» (акт укаранення № 1-5/1132а ад 15.12.2017 г.); 3) у адукацыйным працэсе на геаграфічным факультэце БДУ (акты ўкаранення № 0304/367 ад 28.12.2015 г., № 0304/368 ад 28.12.2015 г., № 0304/599 ад 14.06.2017 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Па тэме дысертацыі апублікавана 18 навуковых работ (без сааўтараў – 13), у тым ліку: 4 – у часопісах, якія ўключаны ў пералік ВАК Рэспублікі Беларусь (3,5 аўт. арк.); 1 – у іншым рэцэнзуемым часопісе; 2 – у замежных часопісах; 7 – у зборніках матэрыялаў канферэнцый; 4 – у зборніках тэзісаў дакладаў. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 7,1 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі** абумоўлены прадметам, мэтай, задачамі і логікай даследавання. Дысертацыя складаецца з пераліку скарачэнняў і ўмоўных абазначэнняў, уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, які ўключае 217 найменняў на 17 старонках, уключаючы 18 публікацый саіскальніка, і дадатка, які змяшчаецца на 173 старонках. Агульны аб'ём дысертацыі без дадатка складае 180 старонак машынапіснага тэксту, змяшчае 18 рысункаў на 11 старонках і 25 табліц на 13 старонках.

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

У главе 1 **«Тэарэтычныя і метадалагічныя падыходы да вывучэння тэрытарыяльнай арганізацыі прамысловасці»** *прааналізавана станаўленне катэгарыяльнага апарату ў геаграфіі прамысловасці, вызначаны метадычныя асновы даследавання тэрытарыяльна-галіновай структуры (ТГС) прамысловасці.*

Тэарэтычным падмуркам даследавання з’яўляюцца канцэпцыі цыклічнага характару эканамічнага развіцця М. Д. Кандрацьева, Ё. Шумпетара і іх паслядоўнікаў. Яны былі разгледжаны праз прызму эканоміка-геаграфічных уяўленняў аб прасторавым развіцці прамысловасці В. Л. Бабурына, А. У. Багдановіча, П. Я. Бакланава, А. П. Горкіна, Л. В. Казлоўскай, І. М. Маергойза, Р. П. Падгрушнага, А. Ц. Хрушчова, У. І. Часоўскага, R. Domański, B. M. Moriarty, H. Simon, M. Storper, T. Stryjakiewicz і інш.




Тэарэтычны складнік работы дазволіў распрацаваць алгарытм эканоміка-геаграфічнага даследавання тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці (рысунак 1), які складаецца з трох этапаў і пяці лагічных узроўняў, што дазволіла абгрунтаваць з улікам паглыблення МГПП неабходнасць распрацоўкі і далейшага выкарыстання ў метадычным апараце каталога прамысловых прадпрыемстваў (табліца 1).

**Рысунак 1. – Алгарытм эканоміка-геаграфічнага даследавання ТГС прамысловасці**

Табліца 1. – Фрагмент каталога прамысловых прадпрыемстваў Беларусі

| Населены пункт | Прадпрыемства | Форма ўласнасці | Год заснавання | Колькасць занятых працоўных, чал. | ВЭД |
|---|---|---|---|---|---|
| г. Жабінка | Вермикулитная компания | ТАА | 2009 | Больш за 100 | CG |
| | Жабинковская сельзохтехника | ААТ | 2000 | Больш за 100 | CK |
| | Жабинковский комбикормовый завод | ААТ | 1957 | Больш за 250 | CA |
| | Жабинковский сахарный завод | ААТ | 1963 | Больш за 250 | CA |

Заўвага. Форма ўласнасці: ААТ – Адкрытае акцыянернае таварыства; ТАА – Таварыства з абмежаванай адказнасцю. Від эканамічнай дзейнасці (ВЭД): CA – вытворчасць харчовых прадуктаў, напояў і табачных вырабаў; CG – вытворчасць гумавых і пластмасавых вырабаў, іншых неметалічных мінеральных прадуктаў; CK – вытворчасць машын і абсталявання, якое не ўключана ў іншыя групіроўкі.

У главе 2 **«Тэрытарыяльна-галіновая трансфармацыя прамысловасці ў Рэспубліцы Беларусь»** *праведзены рэтраспектыўны аналіз развіцця прамысловасці ў XX–XXI стст., вылучаны дамінуючыя фактары развіцця і размяшчэння вытворчасці, прааналізаваны тэрытарыяльна-галіновыя зрухі ў прамысловасці за перыяд суверэнітэту.*

Трансфармацыя тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці – гэта працяглыя колькасныя і якасныя змены ў суадносінах структур прамысловасці і яе рэгіянальных падсістэм, выкліканыя эндагеннымі і экзагеннымі зменамі ў макрарэгіянальным і сусветным становішчы краіны ў геаграфічным падзеле працы.

Прасторавае развіццё краіны дэтэрмініравана зменамі ў дамінуючых фактарах размяшчэння вытворчасці. Фарміраванне рыначных умоў гаспадарання вызначыла сучасныя тэндэнцыі развіцця прамысловасці, да якіх належыць аднесці працэс дэіндустрыялізацыі, інтэнсіўнае павелічэнне колькасці прамысловых арганізацый і няўстойлівы рост вытворчасці (табліца 2), а таксама дамінаванне экзагенных (сусветная рыначная кан'юнктура і ступень інтэрнацыяналізацыі гаспадаркі) і стабілізуючае значэнне эндагенных (макраэканамічная палітыка, пакупніцкая здольнасць насельніцтва і г. д.) фактараў развіцця вытворчасці.

Табліца 2. – Дынаміка рэгіянальнай структуры прамысловасці Беларусі, 1990–2016 гг., у %

| **Вобласці і горад Мінск** | 1990 год | | | 2000 год | | | 2010 год | | | 2016 год | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **IP** | **$N_i$** | **$N_f$** | **IP** | **$N_i$** | **$N_f$** | **IP** | **$N_i$** | **$N_f$** | **IP** | **$N_i$** | **$N_f$** |
| Брэская | 11,1 | 12,2 | 14,2 | 9,0 | 12,3 | 13,3 | 9,5 | 13,1 | 13,4 | 10,5 | 13,1 | 13,5 |
| Віцебская | 15,3 | 13,4 | 15,6 | 19,6 | 12,4 | 13,1 | 17,5 | 11,6 | 13,0 | 15,9 | 11,3 | 12,8 |
| Гомельская | 16,8 | 15,9 | 18,1 | 19,5 | 15,6 | 17,4 | 21,1 | 15,2 | 16,6 | 20,8 | 15,2 | 16,1 |
| Гродзенская | 10,3 | 10,9 | 13,8 | 9,8 | 10,7 | 13,1 | 9,7 | 10,7 | 12,5 | 10,4 | 10,8 | 12,2 |
| г. Мінск | 22,1 | 20,9 | 8,0 | 19,3 | 21,6 | 11,5 | 18,0 | 20,8 | 12,5 | 15,3 | 18,8 | 13,1 |
| Мінская | 11,7 | 13,9 | 16,8 | 10,0 | 14,6 | 19,3 | 14,7 | 16,6 | 19,9 | 18,5 | 18,6 | 20,4 |
| Магілёўская | 12,6 | 12,8 | 13,5 | 12,8 | 12,8 | 12,3 | 9,5 | 12,1 | 12,1 | 8,6 | 12,2 | 11,9 |
| *Беларусь** | *–* | *1593* | *1185* | *9,3* | *1227* | *1522* | *55,5* | *1075* | *2109* | *41,1* | *1027* | *2219* |

Заўвага. Паказчыкі Беларусі адлюстраваны ў абсалютных вымярэннях (*IP* – аб'ём прамысловай вытворчасці, млрд. дол. ЗША; $N_i$ – сярэднегадавая колькасць занятых у прамысловасці, тыс. чал.; $N_f$ – колькасць прамысловых прадпрыемстваў, штук)

Трэнд росту аб'ёмаў прамысловасці, дынаміка і характар адкрыцця вытворчасцей, а таксама аналіз навуковых работ дазволілі вылучыць 4 этапы развіцця эканамічнай актыўнасці ў Беларусі за суверэнны перыяд: дэпрэсіі (адносіцца да апошняй фазы IV цыкла) і ажыўлення, уздыму і вяршыні V-га цыкла Кандрацьева (рысунак 2). Кожны з вылучаных этапаў мае свае асаблівасці дынамікі і ўмоў функцыянавання нацыянальнай прамысловай сістэмы, якія паўплывалі на змены ў тэрытарыяльна-галіновай структуры і вызначаюць прасторава-часавыя заканамернасці развіцця прамысловасці ў краіне.




**Рысунак 2. – Дынаміка аб'ёму прамысловай вытворчасці Беларусі (А) і яе рэгіянальнай структуры (Б) за 1992–2016 гг. у кантэксце цыклаў Кандрацьева, млн. дол. ЗША**

Да асноўных тэрытарыяльна-галіновых зрухаў у прамысловасці Беларусі за перыяд з 1991 г. па 2016 г. можна аднесці: 1) страту Мінскам лідарскай пазіцыі па прычыне сваёй машынабудаўнічай спецыялізацыі; 2) рост значэння экспартаарыентаваных Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцей, якія маюць хімічную і нафтахімічную спецыялізацыю; 3) падзенне вагі Магілёўскай адносна заходніх абласцей рэспублікі (табліца 3). Макраэканамічная палітыка дзяржавы, знешнеэканамічная арыентацыя і развіццё прадпрымальніцтва ў прамысловай вытворчасці прывялі да змены спецыялізацыі краіны ў геаграфічным падзеле працы з павелічэннем вагі сыравінных, традыцыйных і хіміка-тэхналагічных галін прамысловасці (харчовая, хімічная і паліўная прамысловасць).

Табліца 3. – Характарыстыка трансфармацыі тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці Беларусі ў розныя этапы цыклаў Кандрацьева

| Прызнак этапа развіцця | Этап | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Дэпрэсія | Ажыўленне | Уздым | Вяршыня |
| Гады | 1991–1994 | 1995–2000 | 2001–2008 | 2009–? |
| К-цыклы | IV | V | | |
| Дынаміка аб'ёму вытворчасці | Падзенне | Аднаўленчы рост | Стабільны рост | Нестабільны рост |
| Дамінуючыя фактары размяшчэння вытворчасці | 1) Спажывецкі<br>2) Агламерацыйны эфект<br>3) Працоўны | 1) Спажывецкі<br>2) Агламерацыйны эфект<br>3) Інстытуцыянальны | 1) Інстытуцыянальны<br>2) Спажывецкі<br>3) Сыравінны | 1) Інстытуцыянальны<br>2) Спажывецкі<br>3) Сыравінны |
| Структурныя зрухі па В. М. Рабцаву | Істотныя | Нізкія | Вельмі нізкія | Нізкія |
| Дамінуючыя падгаліны па аб'ёму прамысловай вытворчасці | 1) Машынабудаванне<br>2) Лёгкая прамысловасць<br>3) Харчовая прамысловасць | 1) Машынабудаванне<br>2) Харчовая прамысловасць<br>3) Паліўная прамысловасць | 1) Паліўная прамысловасць<br>2) Машынабудаванне<br>3) Харчовая прамысловасць | 1) Харчовая прамысловасць<br>2) Паліўная прамысловасць<br>3) Электраэнергетыка |
| Дамінуючыя рэгіёны па аб'ёму прамысловай вытворчасці | 1) г. Мінск<br>2) Гомельская<br>3) Віцебская | 1) г. Мінск<br>2) Гомельская<br>3) Віцебская | 1) Гомельская<br>2) г. Мінск<br>3) Віцебская | 1) Гомельская<br>2) Мінская<br>3) г. Мінск |

Трансфармацыйныя тэндэнцыі ў тэрытарыяльна-галіновай структуры абумовілі рэгіяналізацыю прамысловасці, пад якой, у шырокім сэнсе, разумееца эвалюцыйны працэс тэрытарыяльнай арганізацыі грамадства, накіраваны на ўзмацненне ролі рэгіёнаў у прамысловым развіцці краіны. Рэгіяналізацыю таксама вызначае выяўленая ў даследаванні актыўная прасторавая экспансія прамысловасці ў прыгарадную зону буйных гарадоў і сельскую мясцовасць. Названая тэндэнцыя абумоўлена рэкамбінацыяй фактараў размяшчэння вытворчасці ў выніку пераходу вытворчасці да рынычных умоў гаспадарання з павелічэннем выкарыстання мясцовых прыродных рэсурсаў і адпаведным паступовым павелічэннем значэння сыравіннага, інстытуцыянальнага і экалагічнага фактараў, што паўплывала на змены ў лінейна-вузлавой тэрытарыяльнай структуры прамысловасці (рысунак 3). Павелічэнне адноснай спалучанасці вузлавых элементаў дае падставы сцвярджаць пра фарміраванне Мінскай прамысловай агламерацыі.




**Рысунак 3. – Лінейна-вузлавая тэрытарыяльная структура (остаў) прамысловасці Беларусі ў 2016 г.**

У главе 3 **«Рэгіянальная дыферэнцыяцыя ўзроўню прамысловага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь»** *прапанавана эканоміка-геаграфічная ацэнка тэрытарыяльнай нераўнамернасці раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця і распрацавана адпаведная тыпалогія за перыяд этапу вяршыні эканамічнага цыкла (2009–2016 гг.)*.

У аснову створанай тыпалогіі раёнаў Беларусі па ўзроўні прамысловага развіцця на прынцыпах цэнтр-перыферыйнасці пакладзены тры крытэрыі: маштаб, геаграфічная канцэнтрацыя і эфектыўнасць прамысловай вытворчасці, якія ўключаюць 7 разлічаных паказчыкаў (табліца 4).

Табліца 4. – Крытэрыі і паказчыкі тыпалогіі раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця

| | **Крытэрыі** | **Паказчыкі** | **Формула** |
|---|---|---|---|
| *Тып (IDI)* | Маштаб прамысловай вытворчасці (*SIP*) | 1. Каэфіцыент спецыялізацыі ($K_{Si}$) | $K_{Si} = \frac{BN_{ij}}{BN_j} / \frac{BN_i}{BN}$ |
| | | 2. Каэфіцыент асацыятыўнай значнасці прамысловасці ($K_{as}$) | $K_{as} = \frac{IP_j/IP}{S_j/S}$ |
| | Геаграфічная канцэнтрацыя прамысловай вытворчасці (*CIP*) | 3. Каэфіцыент сярэдняй маштабнасці прамысловых прадпрыемстваў ($K_f$) | $K_f = \frac{IP_j}{N_{fj}} / \frac{IP}{N_f}$ |
| | | 4. Каэфіцыент адноснай спалучанасці вузлавых элементаў (*LC*) | $LC = \sqrt{S_j/n_j},$ |
| | Эфектыўнасць прамысловай вытворчасці (*IE*) | 5. Экспартная квота прамысловасці ($EQ_i$) | $EQ_i = E_{ij}/IP_j$ |
| | | 6. Удзельная вага інавацыйна-актыўных прамысловых прадпрыемстваў ($Y_{ai}$) | $Y_{ai} = N_{if_j}/N_{f_j}$ |
| *Падтып* | Узровень прамысловага развіцця | 7. Аб’ём прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва (*IPN*) | $IPN = IP_j/N_j$ |

Заўвага. $BN_{ij}$ – сярэднегадавая колькасць занятых у прамысловасці ў $j$-м раёне (чал.); $BN_i$ – сярэднегадавая колькасць занятых у прамысловасці ў краіне (чал.); $BN_j$ – сярэднегадавая колькасць занятага насельніцтва $j$-га раёна (чал.); $BN$ – сярэднегадавая колькасць занятага насельніцтва ў краіне (чал.); $IP_j$ – аб’ём прамысловай вытворчасці $j$-га раёна (дол. ЗША); $IP$ – аб’ём прамысловай вытворчасці краіны (дол. ЗША); $S_j$ – плошча $j$-га раёна (км$^2$); $S$ – плошча краіны (км$^2$); $N_{fj}$ – колькасць прамысловых прадпрыемстваў $j$-га раёна (штук); $N_f$ – колькасць прамысловых прадпрыемстваў краіны (штук); $n_j$ – колькасць вузлавых элементаў (форм ТАП) $j$-га раёна (штук); $E_{ij}$ – экспарт тавараў $j$-га раёна (дол. ЗША); $N_{ifj}$ – колькасць інавацыйна-актыўных прамысловых прадпрыемстваў $j$-га раёна (штук); $N_j$ – колькасць насельніцтва $j$-га раёна (чал.).

Па разлічаным інтэгральным індэксе прамысловага развіцця (*IDI*) былі прапанаваны тры тыпы раёнаў: I. – *Цэнтральныя* (10 % ад іх агульнай колькасці і 68 % аб’ёму прамысловай вытворчасці краіны), II – *Паўперыферыйныя* (40 % і 27 % адпаведна) і III – *Перыферыйныя раёны* (50 % і 5 % адпаведна), а таксама на аснове паказчыка аб’ёму прамысловай вытворчасці на душу насельніцтва 5 падтыпаў: з вельмі высокім, высокім, сярэднім, нізкім і вельмі нізкім узроўнем прамысловага развіцця. Прасторавыя заканамернасці іх распаўсюджанасці наступныя: *тып I* геаграфічна супадае з Мінскай прамысловай агламерацыяй, абласнымі цэнтрамі і раёнамі з буйной экспартаарыентаванай вытворчасцю, дзе канцэнтруецца вытворча-эканамічны патэнцыял краіны; *тып II* характэрны для раёнаў з буйнымі адміністрацыйнымі

цэнтрамі (больш за 100 тыс. чал.) і зонай уплыву міжнародных транспартна-камунікацыйных магістралей; у *тып III* увайшлі раёны са слабым сацыя-дэмаграфічным патэнцыялам, прамысловыя прадпрыемствы якіх пераважна не займаюцца інавацыйнай дзейнасцю (рысунак 4).




**Рысунак 4. – Тыпалогія адміністрацыйных раёнаў Беларусі па ўзроўні прамысловага развіцця**

Інтэгральны індэкс (*IDI*) дазволіў правесці эканоміка-геаграфічную ацэнку тэрытарыяльнай нераўнамернасці раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця за перыяд з 2005 г. па 2016 г. на аснове разлікаў каэфіцыента асіметрыі (γ), каэфіцыента варыяцыі (*V*), індэкса Тэйла (*T*), якая вызначыла, пачынаючы з 2012 г., наяўнасць канвергентных тэндэнцый па прычыне пераважна адстаючай дынамікі развіцця цэнтральных раёнаў адносна паказчыка краіны, што

адлюстроўвае дасягненне вяршыні эканамічнага цыкла. Даследаванне дазволіла выявіць: 1) лідарства ў аб'ёме прамысловай вытворчасці раёнаў, якія пераважна маюць монагаліновую структуру прамысловасці; 2) высокую геаграфічную канцэнтрацыю прамысловасці. Атрыманыя вынікі абумоўліваюць неабходнасць рацыянальных змен да падыходаў у рэгіянальнай прамысловай палітыцы.

У главе 4 **«Прыярытэтныя напрамкі ўдасканалення размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці Рэспублікі Беларусь»** *прааналізавана сучасная рэгіянальная прамысловая палітыка (РПП) ў краіне, прапанаваны напрамак, падыходы, прынцыпы і рэгіянальна-дыферэнцыраваныя рэкамендацыі па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці Рэспублікі Беларусь*.

Згодна з канцэпцыяй іерархічнага фільтравання вытворчасці і распрацаванай тыпалогіяй раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця, намі была створана рэгіянальная схема прыярытэтнай спецыялізацыі прамысловасці (рысунак 5) і спецыяльная дарожная карта дзеянняў па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці для кожнага тыпу.




**Рысунак 5. – Рэгіянальная схема прыярытэтнай спецыялізацыі прамысловасці адміністрацыйных раёнаў Беларусі**

Аналіз навуковых работ і праведзены SWOT-аналіз прамысловага развіцця Беларусі паказаў, што асноўнымі недахопамі рэгіянальнай прамысловай

палітыкі ў краіне з'яўляюцца: 1) дырэктыўны характар рэалізацыі ў праграмных дакументах пры адсутнасці механізмаў комплекснага аналізу іх выканання; 2) замаруджанае рэагаванне дзяржаўнага кіраўніцтва на змены ў кан'юнктуры на ўнутранным і знешніх рынках; 3) наяўнасць супярэчнасцей паміж галіновымі і тэрытарыяльнымі аспектамі дзяржаўнай палітыкі; 4) слабы ўлік асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў і іх месца ва ўнутрыдзяржаўным геаграфічным падзеле працы.

Зніжэнне дыверсіфікаванасці галіновай структуры і адпаведны няўстойлівы рост прамысловасці, выкліканыя яе знешнегандлёвай арыентацыяй, а таксама выяўлены працэс рэгіяналізацыі абумоўліваюць вызначэнне прыярытэтнага кірунку ўдасканалення прамысловай палітыкі, аснову якога складае інстытуцыянальны працэс пераразмеркавання функцый у кіраванні прамысловасцю паміж цэнтральнымі і рэгіянальнымі органамі ўлады, які павінен садзейнічаць развіццю рэгіянальнай канкурэнцыі і фарміраванню здольнасці да самастойнай эканамічнай і фіскальнай дзейнасці.

Рэгіянальна-дыферэнцыраваныя рэкамендацыі па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці прадугледжваюць: 1) для цэнтральных раёнаў (тып *I*) акцэнтаваць увагу на паскораным развіцці высокатэхналагічнага сектара ў СЭЗ і тэхнапарках шляхам прамых інвестыцый або падатковых ільгот; 2) для паўперыферыйных раёнаў (тып *II*) – на развіцці спадарожнай інфраструктуры і вытворчасцей базавай спецыялізацыі шляхам актыўнай падтрымкі кластарнай ініцыятывы і стварэння бізнес-інкубатараў; 3) для перыферыйных раёнаў (тып *III*) праводзіць падтрымку традыцыйных галін спецыялізацыі праз прамую і ўскосную дапамогу малому і сярэдняму прадпрымальніцтву, паляпшэнне інстытуцыянальнага асяроддзя і актывізацыю мясцовай супольнасці. Названыя рэкамендацыі дазволяць рацыянальна сканцэнтраваць грашовыя сродкі дзяржавы на рэалізацыі перспектыўных праектаў у прамысловай вытворчасці, што неабходна ва ўмовах «даганяючага» сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

У дысертацыі ўпершыню праведзена эканоміка-геаграфічнае даследаванне трансфармацыі тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці Беларусі за перыяд з 1991 г. па 2016 г. на аснове канцэпцыі доўгіх цыклаў эканамічнай кан'юнктуры М. Кандрацьева. Сутнасць метадалогіі даследавання заключаецца ў выкарыстанні метадаў колькаснай ацэнкі і якаснага аналізу фактараў развіцця і размяшчэння вытворчасці, тэрытарыяльна-галіновых зрухаў і тэрытарыяльнай нераўнамернасці рэгіёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця праз прызму

прапанаванай перыядызацыі нацыянальнай эканомікі адпаведна этапам і фазам доўгіх цыклаў эканамічнай актыўнасці.

1. Удакладнена і абгрунтавана паняцце тэрытарыяльнай арганізацыі прамысловасці, пад якім разумеецца бесперапынны цыклічны працэс у прамысловай сістэме living розны узроўню, накіраваны на дасягненне максімізацыі прыбытку і павышэнне яе інавацыйнай канкурэнтаздольнасці шляхам упарадкаванага перамяшчэння і лакалізацыі рабочай сілы, рэчываў, энергіі, капіталу і інфармацыі паміж яе сістэмнымі элементамі. Прасторавы малюнак гэтага працэсу ў пэўны часавы адрэзак называецца тэрытарыяльнай структурай прамысловасці. Фарміраванне азначанай катэгорыі звязана са станаўленнем у навуцы ў другой палове XX ст. сістэмна-структурнага падыходу, якое было абумоўлена матэматызацыяй геаграфіі ў выніку «колькаснай рэвалюцыі» [2, 3, 7, 15, 17].

2. Вызначана, што ў савецкі перыяд развіццё прамысловасці ў БССР адставала ад многіх рэспублік СССР. Гэта адставанне было ліквідавана на мяжы паміж цыкламі Кандрацьева па прычыне кардынальнай змены эканоміка-геаграфічнага і геапалітычнага становішча. Азначаныя абставіны прывялі да стварэння ў рэспубліцы магутнай машынабудаўнічай і хімічнай прамысловасці, накіраванай на забеспячэнне прамысловай прадукцыяй дзяржаў-членаў СЭУ і савецкага ВПК, што абумоўлівае важную ролю спажывецкага, працоўнага, транспартна-інфраструктурнага і ваенна-стратэгічнага фактараў пры размяшчэнні вытворчых сіл [3, 11, 16].

3. За перыяд даследавання былі вылучаны 4 этапы развіцця эканамічнай актыўнасці ў Беларусі: *дэпрэсіі* (1991–1994 гг.), якія адносіцца да апошняй фазы IV цыкла, *ажыўлення* (1995–2000 гг.), *уздыму* (2001–2008 гг.) і *вяршыні* (2009–2016 гг.) V-га цыкла, што дазволіла правесці сінтэз і структурыраваць атрыманую інфармацыю. Да асноўных прасторава-часавых заканамернасцей развіцця прамысловасці належыць залічыць: 1) няўстойлівы рост прамысловай вытворчасці ў кульмінацыйныя этапы дэпрэсіі і вяршыні эканамічнага цыкла па прычыне высокай залежнасці нацыянальнай эканомікі ад кан'юнктуры на знешніх рынках; 2) наяўнасць істотных структурных зрухаў на этапе пераходу ад IV да V-га цыклаў у выніку перабудовы эканомікі і фарміравання рыначных умоў гаспадарання; 3) змену дывергентных на канвергентныя тэндэнцыі ў рэгіянальнай структуры прамысловасці на ўзроўні адміністрацыйных раёнаў і гарадоў абласнога падпарадкавання, якая адбылася ў перыяд пераходу ад павышальнай да паніжальнай фазы (этап вяршыні) эканамічнага цыкла ў выніку запавольвання тэмпаў росту галін спецыялізацыі і адпаведнага падзення аб'ёмаў вытворчасці ў цэнтральных рэгіёнах [5, 10, 11].

4. Бальная ацэнка дазволіла вызначыць змену дамінуючых фактараў размяшчэння вытворчасці ў выніку цыклічнага характару эканамічнага развіцця за даследаваны перыяд, што адлюстроўвае сучасныя трансфармацыйныя

працэсы ў тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці. На першыя пазіцыі выйшлі як новыя рыначныя (інстытуцыянальны, экалагічны), так і старыя (спажывецкі, сыравінны) фактары размяшчэння вытворчасці, што прывяло да актыўнай экспансіі прадпрыемстваў у прыгарадную зону буйных гарадоў. У выніку адбываецца пераход «малюнку» лінейна-вузлавой тэрытарыяльнай структуры з раўнамерна-вузлавога ў агламерацыйна-вузлавы, які вызначае фарміраванне ў структуры нацыянальнай эканомікі Мінскай прамысловай агламерацыі [2, 3, 7, 8, 9, 12].

5. Асноўнымі структурнымі зрухамі ў прамысловым развіцці Беларусі за перыяд з 1991 г. па 2016 г., якія абумоўлены дамінаваннем экзагенных фактараў, з’яўляюцца: 1) змяншэнне долі апрацоўчай прамысловасці за кошт павелічэння вагі вытворчасці электраэнергіі і горназдабываючай прамысловасці, якое было абумоўлена палітыкай коштаў на энерганосьбіты; 2) змяншэнне вагі базавых галін спецыялізацыі прамысловасці (вытворчасць машын, транспартных сродкаў і абсталявання, тэкстыльная вытворчасць, вытворчасць адзення і абутку), якое звязана з іх высокай матэрыяла- і працаёмістасцю, састарэлай тэхналагічнай базай і агульным падзеннем канкурэнтаздольнасці прадукцыі на знешніх і ўнутраным рынках; 3) павелічэнне долі традыцыйных галін спецыялізацыі прамысловасці (вытворчасць харчовых прадуктаў, будматэрыялаў і іншых відаў прамысловай дзейнасці), якое тлумачыцца наяўнасцю мясцовай сыравіны, шырокім развіццём прадпрымальніцтва і агульным павышэннем попыту на гэтую прадукцыю на ўнутранным рынку; 4) рост вагі экспартаарыентаваных галін прамысловасці (металургічная вытворчасць, вытворчасць коксу і нафтапрадуктаў і хімічная вытворчасць), якія звязаны з наяўнасцю таннай сыравіны, спрыяльнай кан’юнктурай і стабільным попытам на прадукцыю (нафтапрадукты, калійныя ўгнаенні, чугун і стальны пракат) на знешніх рынках [5, 13, 14].

6. Павышэнне канцэнтрацыі і змяншэнне дыверсіфікаванасці галіновай структуры ў пачатку XXI ст. абумовілі змены ў рэгіянальнай структуры прамысловасці: лідарства ў вытворчасці прамысловай прадукцыі перайшло ад Мінска з магутным комплексам машынабудавання да Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцей, таксама узрасла вага Брэсцкай, Гродзенскай і зменшылася Магілёўскай абласцей. На ўзроўні адміністрацыйных раёнаў і гарадоў абласнога падпарадкавання назіраецца высокая канцэнтрацыя вытворчасці ў буйных гарадах краіны з тэрытарыяльным расканцэнтраваннем дробных вытворчасцей на велізарнай па плошчы перыферыі. Так, прапанаваная тыпалогія раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця на аснове крытэрыяў маштабу, геаграфічнай канцэнтрацыі і эфектыўнасці вытворчасці дазволіла ўсталяваць дамінаванне ў аб’ёме вырабу прамысловай прадукцыі дванаццаці адміністрацыйных раёнаў разам з гарадамі абласнога падпарадкавання, на якія

прыходзіцца каля 2/3 агульнарэспубліканскага аб’ёму прамысловай прадукцыі, што абумоўлівае неабходнасць удасканалення рэгіянальнай і прамысловай палітыкі ў галіне дзяржаўнага рэгулявання і інвестыцыйнай падтрымкі рэгіёнаў [1, 4, 6].

7. Рэгіянальна-дыферэнцыраваныя рэкамендацыі па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці Рэспублікі Беларусь, якія распрацаваны на аснове прапанаванай тыпалогіі раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця, прадугледжваюць: 1) прыцягненне інвестыцый у вылучаныя праблемныя раёны, якія змянілі сваё месца ва ўнутрыдзяржаўным геаграфічным падзеле працы за перыяд даследавання (2005–2016 гг.); 2) вызначэнне прыярытэтнай спецыялізацыі ў прамысловасці для кожнага тыпу раёнаў на аснове канцэпцыі іерархічнага фільтравання (*тып I* – перадавыя і хіміка-тэхналагічныя; *тып II* – базавыя; *тып III* – традыцыйныя галіны) і адпаведную дзяржаўную падтрымку ў размяшчэнні новых вытворчасцей; 3) змену раўнамернага ў перыяд павышальнай фазы на стымулюючае фінансаванне ў перыяд паніжальнай фазы эканамічнага цыкла; 4) рэгіяналізацыю як прыярытэтны напрамак удасканалення прамысловай палітыкі; што дазволіць рацыянальна сканцэнтраваць дзяржаўныя сродкі і можа стварыць каркас разнастайных зон апераджальнага развіцця ў краіне [4, 18].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

1. Алгарытм эканоміка-геаграфічнага даследавання трансфармацыі тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці Рэспублікі Беларусь і яе вынікі рэкамендуюцца для распрацоўкі стратэгіі рэгіянальнага эканамічнага развіцця. Прапанаваныя падыходы і прынцыпы рэгіянальнай прамысловай палітыкі дазволяць удасканаліць стымулюючае сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёнаў (ДНУ «НДЭІ Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь», акт укаранення № 57-02/1875 ад 20.12.2017).

2. Статыстычная база даследавання 118 адміністратыўных раёнаў, 6 абласцей і горада Мінска за перыяд з 2005 г. па 2016 г. і каталог прамысловых прадпрыемстваў можа быць выкарыстаны для стварэння картаграфічнага матэрыялу па асаблівасцях развіцця галін прамысловасці (РУП «Белкартаграфія», акт укаранення № 1-5/1132а ад 15.12.2017 г.).

3. Палажэнні і матэрыялы дысертацыі выкарыстаны ў навучальным працэсе пры падрыхтоўцы лекцыйных курсаў, метадычных матэрыялаў для практычных заняткаў і курсавых работ (геаграфічны факультэт БДУ, акты ўкаранення № 0304/367 ад 28.12.2015 г., № 0304/368 ад 28.12.2015 г., № 0304/599 ад 14.06.2017 г.).

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

*Артыкулы ў часопісах, уключаных у спіс ВАК Рэспублікі Беларусь*

1. Запрудский, И. И. Экспортный потенциал промышленности регионов Беларуси / И. И. Запрудский, А. Н. Шавель // Весці БДПУ. Серия 3. Фізіка. Матэматыка. Інфарматыка. Біялогія. Геаграфія. – 2016. – № 1. – С. 57–64.

2. Запрудский, И. И. Системно-структурный подход в исследовании форм территориальной организации промышленного производства / И. И. Запрудский // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серия 5. Хімія. Біялогія. Навукі аб зямлі. – 2016. – № 2. – С. 70–75.

3. Запрудскі, І. І. Аналіз сучаснага стану тэрытарыяльнай структуры прамысловасці Рэспублікі Беларусь і яго картаграфаванне / І. І. Запрудскі // Весці БДПУ. Серыя 3. Фізіка. Матэматыка. Інфарматыка. Біялогія. Геаграфія. – 2017. – № 1. – С. 33–39.

4. Запрудский, И. И. Региональная дифференциация промышленного развития в Республике Беларусь / И. И. Запрудский, В. П. Сидоренко // Журн. Белорус. гос. ун-та. География. Геология. – 2017. – № 2. – С. 63–72.

5. Запрудский, И. И. Территориально-отраслевые сдвиги в промышленности в Республике Беларусь в постсоветский период / И. И. Запрудский // Региональные исследования. – 2018. – № 2 (60). – С. 101–110.

*Артыкулы ў іншых рэцэнзаваных часопісах*

6. Запрудский, И. И. Особенности неравномерности промышленного развития регионов Беларуси в XXI веке / И. И. Запрудский // Проблемы безопасности российского общества. – 2015. – № 2. – С. 185–191.

7. Запрудский, И. И. Современный взгляд на теорию размещения хозяйства Яна Тинбергена и Хендрикуса Боса / И. И. Запрудский // Геаграфія. – 2015. – № 11 (120). – С. 3–9.

*Матэрыялы канферэнцый*

8. Запрудский, И. И. К вопросу о выделении границ Минской агломерации / И. И. Запрудский, Г. З. Озем // Эволюция общественно-географической мысли: материалы международной научной конференции, Санкт-Петербург, 29–30 сентября 2012 г.; редкол.: А. Г. Дружинин [и др.]. – Санкт-Петербург – Ростов на Дону, 2012. – С. 198–207.

9. Запрудский, И. И. Роль Минской промышленной агломерации в территориальной структуре хозяйства Беларуси / И. И. Запрудский, А. В. Флерьянович // Проблемы и перспективы социально-экономической географии (к 100-летию со дня рождения И. И. Трухана): материалы международной научно-практической конференции, Минск, 12–14 ноября 2015 г.; редкол.: Г. З. Озем (пред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2016. – С. 64–69.

10. Запрудскі, І. І. Прамысловасць Рэспублікі Беларусь у пераходны перыяд (стадыйна-эвалюцыйны падыход) / І. І. Запрудскі // X Машэраўскія чытанні: матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі студэнтаў, аспірантаў і маладых вучоных, Віцебск, 14 кастрычніка 2016 г. / Віцеб. дзярж. ун-т; рэдкал.: І. М. Прышчэпа (гал. рэд.) [і інш.]. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2016. – С. 49–51.

11. Запрудскі, І. І. Погляды А. А. Смоліча на развіццё прамысловай вытворчасці ў Беларусі / І. І. Запрудскі // Социально-экономическая география в XXI веке: региональное развитие (к 125-летию со дня рождения профессора А. А. Смолича): материалы Межвузовского республиканского семинара, Минск, 17–18 ноября 2016 г. / БГУ, географ. фак., каф. экономической географии Беларуси и государств Содружества, каф. экономической географии зарубежных стран; редкол.: Е. А. Антипова (пред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2017. – С. 7–11.

12. Запрудский, И. И. Значение теорий размещения промышленности для географического образования / И. И. Запрудский // Географические аспекты устойчивого развития регионов [Электронный ресурс]: материалы II международной научно-практической конференции, Гомель, 23–24 марта 2017 г.; редкол.: А. И. Павловский (гл. ред.) [и др.]. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2017. – С. 751–755.

13. Особенности развития и специализация промышленности регионов Республики Беларусь / И. И. Запрудский, А. Г. Соловьев, А. В. Флерьянович, А. Н. Шавель // «Теория и практика современных географических исследований» в рамках XIII Большого географического фестиваля: материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Санкт-Петербург, 7–9 апреля 2017 г.; редкол.: А. И. Краснов [и др.]. – Санкт-Петербург: Свое издательство, 2017. – С. 804–809.

14. Запрудский, И. И. К вопросу о становлении отраслево-статистического подхода в географии промышленности / И. И. Запрудский // География в современном мире: вековой прогресс и новые приоритеты: материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, посвященной 100-летию создания первого в России специального географического высшего учебного заведения – Географического

института, проведенной в рамках XIV Большого географического фестиваля, Санкт-Петербург, 6–8 апреля 2018 г.; редкол.: А. И. Краснов [и др.]. – Санкт-Петербург: Свое издательство, 2018. – С. 944–946.

*Тэзісы дакладаў*

15. Запрудский, И. И. Понятие территориальной организации промышленности в географических исследованиях / И. И. Запрудский // Демографические риски XXI века (к Международному дню народонаселения): материалы II Межвузовского студенческого семинара, Минск, 14 мая 2015 г. / БГУ; редкол.: Е. А. Антипова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2015. – С. 25–27.

16. Запрудский, И. И. Классификация государств Центральной и Восточной Европы по уровню промышленного развития / И. И. Запрудский // Демографические риски XXI века (к Международному дню народонаселения): материалы III Межвузовской студенческой конференции с международным участием, Минск, 13 мая 2016 г. / БГУ, геогр. фак.; редкол.: Е. А. Антипова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2016. – С. 24–25.

17. Запрудский, И. И. Научные подходы в географии промышленности на постсоветском пространстве / И. И. Запрудский // Демографические риски XXI века (к Международному дню народонаселения): материалы IV Межвузовской студенческой конференции, Минск, 12 мая 2017 г. / БГУ, геогр. фак.; редкол.: Е. А. Антипова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Белсэнс, 2017. – С. 21–24.

18. Запрудскі, І. І. Рэгіянальная прамысловая палітыка ў Рэспубліцы Беларусь у сучасны перыяд / І. І. Запрудскі // Демографические риски XXI века (к Международному дню народонаселения): тез. докл. V межвуз. студенческой конф. с международным участием, Минск, 18 мая 2018 г. / БГУ; редкол.: Е. А. Антипова (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БГУ, 2018. – С. 16–18.

# РЭЗЮМЭ

Запрудскі Ілья Ігаравіч

## Трансфармацыя тэрытарыяльна-галіновай структуры і рэгіяналізацыя прамысловасці Рэспублікі Беларусь

**Ключавыя словы:** геаграфія прамысловасці, тэрытарыяльная арганізацыя прамысловасці, доўгія цыклы эканамічнай актыўнасці, тэрытарыяльна-галіновая структура, трансфармацыя, тэрытарыяльна-галіновыя зрухі, фактары размяшчэння вытворчасці, рэгіянальная структура, рэгіяналізацыя, рэгіянальная прамысловая палітыка.

**Мэта работы:** выявіць прасторава-часавыя заканамернасці развіцця і змен тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці Рэспублікі Беларусь для абгрунтавання рэгіянальна-дыферэнцыраваных рэкамендацый па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл.

**Метады даследавання:** метад гістарычнага падыходу, аналізу і сінтэзу, матэматыка-статыстычны, метад групіроўкі, метад геаграфічнай сістэматызацыі, метад экспертнай ацэнкі, параўнальна-геаграфічны і картаграфічны.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна:** 1) распрацаваны алгарытм эканоміка-геаграфічнага даследавання тэрытарыяльна-галіновай структуры прамысловасці; 2) упершыню праведзена перыядызацыя развіцця прамысловасці Беларусі за перыяд з 1991 г. па 2016 г. у кантэксце доўгіх цыклаў эканамічнай актыўнасці М. Кандрацьева; 3) упершыню на аснове сістэмна-структурнага падыходу і матэматыка-статыстычнага аналізу выяўлены тэрытарыяльна-галіновыя зрухі ў прамысловасці Беларусі за перыяд суверэнітэту; 4) упершыню на прынцыпах цэнтр-перыферыйнасці распрацавана тыпалогія раёнаў па ўзроўні прамысловага развіцця; 5) упершыню прапанаваны рэгіянальна-дыферэнцыраваныя рэкамендацыі па ўдасканаленні размяшчэння вытворчых сіл у прамысловасці Рэспублікі Беларусь.

**Ступень выкарыстання:** тэарэтычныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваюцца ў ДНУ «НДЭІ Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь» пры распрацоўцы стратэгіі рэгіянальнага эканамічнага развіцця; для стварэння картаграфічнага матэрыялу па асаблівасцях развіцця галін прамысловасці ў РУП «Белкартаграфія»; у навучальным працэсе пры падрыхтоўцы спецыялістаў на геаграфічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Галіна выкарыстання:** дзяржаўная рэгіянальная і прамысловая палітыка, тэрытарыяльнае планаванне, сацыяльна-эканамічнае картаграфаванне, навучальны працэс.

# РЕЗЮМЕ

Запрудский Илья Игоревич

**Трансформация территориально-отраслевой структуры и регионализация промышленности Республики Беларусь**

**Ключевые слова:** география промышленности, территориальная организация промышленности, длинные циклы экономической активности, территориально-отраслевая структура, трансформация, территориально-отраслевые сдвиги, факторы размещения производства, региональная структура, регионализация, региональная промышленная политика.

**Цель работы:** выявить пространственно-временные закономерности развития и изменений территориально-отраслевой структуры промышленности Республики Беларусь для обоснования регионально-дифференцированных рекомендаций по совершенствованию размещения производительных сил.

**Методы исследования:** метод исторического подхода, анализа и синтеза, математико-статистический, метод группировки, метод географической систематизации, метод экспертной оценки, сравнительно-географический и картографический.

**Полученные результаты и их новизна:** 1) разработан алгоритм экономико-географического исследования территориально-отраслевой структуры промышленности; 2) впервые проведена периодизация развития промышленности за период с 1991 г. по 2016 г. в контексте длинных циклов экономической активности Н. Кондратьева; 3) впервые на основе системно-структурного подхода и математико-статистического анализа выявлены территориально-отраслевые сдвиги в промышленности Беларуси за период суверенитета; 4) впервые на принципах центр-периферийности разработана типология районов по уровню промышленного развития; 5) впервые предложены регионально-дифференцированные рекомендации по совершенствованию размещения производительных сил в промышленности Республики Беларусь.

**Степень использования:** теоретические положения и результаты диссертационного исследования используются в ГНУ «НИЭИ Министерства экономики Республики Беларусь» при разработке стратегии регионального экономического развития; для создания картографического материала по особенностям развития отраслей промышленности в РУП «Белкартография»; в учебном процессе при подготовке специалистов на географическом факультете Белорусского государственного университета.

**Область применения:** государственная региональная и промышленная политика, территориальное планирование, социально-экономическое картографирование, учебный процесс.

## SUMMARY

Zaprudski Ilya Iharavich

**Transformation of the territorial-sectoral structure and regionalization of the industry of the Republic of Belarus**

**Key words:** industrial geography, territorial organization of industry, long cycles of economic activity, territorial and sectoral structure, transformation, territorial and sectoral shifts, location factors for industries, regional structure, regionalization, regional industrial policy.

**Objective:** identification of the main spatial-temporal patterns of industrial development in the Republic of Belarus to develop recommendations for improving the regional industrial policy.

**Research methods:** historical method, analysis and synthesis, mathematical-statistical, method of grouping, method of geographical systematization, method of expert assessment, comparative geographical and cartographic.

**The obtained results and their novelty:** 1) methodology of economic and geographical study of the territorial and sectoral structure of industry is developed; 2) for the first time, periodization of industrial development is conducted for the period from 1991 to 2016. in the context of N. Kondratiev's long cycles of economic activity; 3) for the first time, on the basis of system-structural approach and mathematical-statistical analysis, territorial-sectoral shifts in the industry of Belarus over the period of sovereignty are revealed; 4) for the first time, typology of regions by the level of industrial development is developed on the principles of center-periphery; 5) for the first time, spatial differentiated recommendations are proposed at the regional level for the implementation of industrial policy in the Republic of Belarus.

**Scope of application:** theoretical provisions and results of the dissertation research are used by the State Research Institution "The Economy Research Institute of the Ministry of Economy of the Republic of Belarus" to develop a strategy for regional economic development; by the Republican Unitary Enterprise "Belkartografiya" to create cartographic materials on the specific features of sectoral industrial development; in the educational process for training specialists at the Faculty of Geography of the Belarusian State University.

**Area of application:** state regional and industrial policy, territorial planning, socio-economic mapping, educational process.